УДК 94(476)+378.147

# РЭГІЯНАЛІЗАЦЫЯ ПРАЦЭСАЎ САЦЫЯЛЬНАГА РЭКРУТАВАННЯ АДКАЗНЫХ РАБОТНІКАЎ: З ВОПЫТУ ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ ДЛЯ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БЕЛАРУСІ

**І.А. Пушкін**
Магілеўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання, г. Магілеў, Рэспубліка Беларусь

Для паспяховага развіцця эканомікі Рэспублікі Беларусь вельмі актуальным з’яўляецца правядзенне аналізу і ўсебаковага вывучэння шляхоў гападарчага развіцця Беларусі ў розныя гістарычныя перыяды. У прыватнасці, у 1970–1980-я гг., калі Савецкая Беларусь стала займаць вядучыя пазіцыі ў эканоміцы СССР. Атрыманыя вынікі з’явяцца зыходнымі дадзенымі для распрацоўкі практычных рэкамендацый у сферы эканомікі і сістэме кіравання прамысловасцю Рэспублікі Беларусь, для падрыхтоўкі і выдання навучальных дапаможнікаў, будуць выкарыстаныя ў навучальным працэсе ўстаноў вышэйшай адукацыі.

1970–1980-я гг. – гэта час далейшага функцыянавання і развіцця ў Беларусі, як і ў цэлым у СССР, адміністратыўна-каманднай эканамічнай сістэмы. У першай палове 1970-х гг. імпульс, атрыманы рэформай 1965 г., паступова затухаў, у эканоміцы сталі нарастаць негатыўныя з’явы, якія ўсе больш узмацняліся ў наступныя гады. Беларуская эканоміка, як і ўся савецкая, усе больш адставала ад эканомік вядучых капіталістычных краін па эфектыўнасці, тэхнічным і тэхналагічным узроўням, большасці іншых паказчыкаў. Каб спыніць хуткае зніжэнне тэмпаў эканамічнага росту, кіраўніцтва СССР (БССР) абапіралася ў асноўным на пазаэканамічныя, адміністратыўна-камандныя метады.

Пытанням работы з кадрамі ўвесь час надавалі вялікую ўвагу ЦК КПСС і КПБ. Прынцыпы падбора, растаноўкі і выхавання кадраў, кадравая палітыка на рэгіянальным узроўні знаходзіліся пад кантролем і курыраваліся першымі сакратарамі абкамаў КПБ. Рэгіянальныя партыйныя органы ў асноўным правільна праводзілі кадравую палітыку. Аднак былі нярэдкія выпадкі, калі пры вылучэнні работнікаў не прымаліся да ўвагі іх асобасныя і дзелавыя якасці. У выніку ў ролі кіраўнікоў з’яўляліся слабыя, безыніцыятыўныя работнікі, ці людзі, якія не карысталіся аўтарытэтам, а часам і відавочна скампраметаваўшыя сябе ў мінулым [2; 4]. Падобнае было магчымым таму, што стыль і метады, падрыхтоўка спецыялістаў і кіраўнікоў у БССР не адпавядалі ўзрослым задачам гаспадарчага і культурнага развіцця.

Аналіз прафесіяналізму, узроўню адукацыі, сістэмы павышэння кваліфікацыі дазволіў выявіць залежнасць паміж сістэматычнымі рэарганізацыямі сістэмы кіраўніцтва краінай, кіравання прамысловасцю, метадамі палітычных кампаній у грамадска-палітычным жыцці краіны і рэарганізацыямі ў сістэме падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэнні кваліфікацыі кадраў для прамысловасці, і метадамі правядзення арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў на вытворчасці, падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў.

У сацыяльным абліччы кіруючых кадраў у 1960–1980-я гг. адзначаюцца тэндэнцыі рэгіяналізацыі працэсаў сацыяльнага рэкрутавання адказных работнікаў, да ўзмацнення самадастатковасці мясцовых кадравых рэсурсаў для папаўнення складу кіруючых работнікаў і іншых спецыялістаў. Гэта выяўлялася як у цэлым па складзе кіраўнікоў, так і па тэрытарыяльным групам пасад. Калі ў 1940–1950-х гг. працэс узнаўлення кадраў істотна карэктаваўся цэнтрам (рэгуляванне адбору, масавыя перамяшчэнні і мабілізацыя работнікаў і інш.), цяпер працэсы іх станаўлення набылі пэўную аўтаномнасць. Гэта было выклікана тым, што кадравая палітыка, якая праводзілася кампартыяй і савецкім урадам, далека не заўседы адпавядала тым палітычным і сацыяльна-эканамічным працэсам, якія адбываліся ў СССР. Таму нежаданне палітычнай эліты ісці на саступкі ў прынцыповых пытаннях падрыхтоўкі і размеркавання кадраў прыводзіла да адмоўных з’яў у развіцці савецкай гаспадарчай сістэмы і дзяржавы ў цэлым. Менавіта аб’ектыўная неабходнасць, звязаная з далейшым развіццем савецкай эканомікі, прымушала палітычную эліту перадаваць значныя паўнамоцтвы ў

вырашэнні кадравых пытанняў у рэгіянальныя ўладныя структуры, што аслабляла кантроль цэнтра над палітычнымі і сацыяльна-эканамічнымі працэсамі.

Працэс падрыхтоўкі адказных спецыялістаў у 1970–1980-я гг. стаў ажыццяўляцца ў рэгіенах Савецкай Беларусі. Дзяржаўныя і гаспадарчыя структуры БССР фактычна сталі забяспечвацца кіраўнікамі, падрыхтаванымі на месцах, а цэнтральная ўлада губляла адзін з рычагоў, з дапамогай якога магла кантраляваць працэс расстаноўкі кадраў на ключавыя пасады. Расійскі даследчык А. Федараў сцвярджае, што кадравая палітыка КПСС і савецкага ўрада паступова перастала адказваць патрэбам не толькі эканомікі і грамадства, але і інтарэсам самой наменклатуры ў рэгіенах. Мясцовыя кіраўнікі ў 1970–1980-я гг. фактычна засяродзілі ў сваіх руках уладу ва ўстановах, якія ўзначальвалі, часцяком ігнаруючы і нават адкрыта сабатуючы спробы цэнтра ўтрымаць кантроль у пытаннях падрыхтоўкі і расстаноўкі кадраў [6].

У выніку правадзімай кадравай палітыкі да 1980-х гг. у БССР склаўся ўстойлівы тып савецкай палітычнай і гаспадарчай эліты, які характарызуецца стабільнымі прапорцыямі асноўных яе кампанентаў. У эвалюцыі эліты прысутнічала пэўная скіраванасць да павелічэння ў яе складзе долі выхадцаў з вобласці пражывання, з гарадскіх паселішчаў. Асноўныя кіруючыя кадры сталі рэкрутаваць з гарадскіх, а не сельскіх жыхароў. Адукацыя, а не класавая прыналежнасць, стала адыгрываць вырашальную ролю пры заняцці адказных пасад. Таму ў 1980-я гг. менавіта прадстаўнікі інтэлігенцыі, у большасці сваей тэхнічнай, сталі пераважаць у складзе кіруючых кадраў дзяржаўных і гаспадарчых структур. Далейшае павялічэнне долі тэхнічнай інтэлігенцыі на наменклатурных пасадах, якое насіла аб’ектыўны і заканамерны характар, прыводзіла да неабходнасці перабудовы самой сістэмы ўзаемаадносін палітычнай эліты і кіруючых работнікаў усіх узроўняў.

Неабходна адзначыць, што фармаванне кадравага патэнцыялу БССР у значнай ступені залежыла ад палітыкі кіруючых органаў СССР. Склад кіруючых работнікаў і спецыялістаў рэгіянальнага ўзроўню фармаваўся адміністратыўным шляхам (адміністрацыяй і кіруючымі органамі КПБ) пры мінімальным (фармальным) удзеле грамадскасці ў выглядзе прафсаюзаў. Спробы ў 1970–1980-я гг. выправіць становішча ў эканоміцы шляхам змяняльнасці кадраў і ўкаранення розных метадаў павышэння якасці і эфектыўнасці кадравага патэнцыялу ва ўмовах існавання савецкай эканамічнай сістэмы, не прынесла чакаемага выніку. Выразна прасочвалася нізкая змяняльнасць кіруючых кадраў, ды і то ў асноўным па гарызанталі, што істотна перашкаджала абнаўленню кадравага патэнцыялу і развіццю эканомікі БССР [1; 5].

Прынцып «стабільнасці кадраў» прыводзіў да таго, што мясцовыя кіраўнікі з часам сталі паўнаўладныя гаспадарамі ва ўстановах і аб’ектах гаспадаркі, якімі кіравалі. Павелічэнне долі тэхнічнай інтэлігенцыі на намэнклатурных пасадах прыводзіла да канцэнтрацыі фактычнай улады ў эканоміцы БССР у руках «камандзіраў прамысловасці» і іншых мясцовых гаспадарчых кіраўнікоў, што падрывала пазіцыі галоўнага ідэалагічнага цэнтра – кампартыі. Стварэнне цесных сувязяў ўнутры наменклатуры, з аднаго боку, прыводзіла да фактычнай беспакаранасці мясцовых кіраўнікоў, з другога – ўваходзіла ў супярэчнасць з аб’ектыўнымі заканамернасцямі развіцця савецкага грамадства і руйнавала і без таго хісткі аўтарытэт партыі ў шырокіх народных масах. Нягледзячы на тое, што ўлада спрабавала шляхам прадастаўлення розных ільгот і прывілеяў забяспечыць прадстаўнікам наменклатуры і тэхнічнай інтэлігенцыі больш высокі ўзровень жыцця, інтарэсы палітычнай эліты і гэтых слаеў насельніцтва ўсе больш разыходзіліся [3, с. 72]. Вынікам стала рэзкае пагаршэнне эканамічнага стану грамадства і распад СССР.

Назапашаны вопыт падрыхтоўкі кадраў для прамысловасці ў Савецкай Беларусі дазваляе зразумець наступствы рэгіяналізацыя працэсаў сацыяльнага рэкрутавання адказных работнікаў у сучаснай Рэспубліке Беларусь, дзе падбор кіраўнікоў і спецыялістаў часцяком залежыць ад рэгіену паходжання або месца атрымання адукацыі.

Спіс літаратуры

1. Пушкін, І. А. Склад і змяняльнасць работнікаў кіруючага апарата органаў дзяржаўнага кіравання, прамысловых прадпрыемстваў і яб'яднанняў БССР (1970–1980-я гг.) / І. А. Пушкін // Романовские чтения – 12: сборник статей Международной научной конференции / под общ. ред. А. С. Мельниковой. – Могилев: МГУ им. А.А.Кулешова, 2017. – С. 120–122.
2. Пушкін, І.А. Кадравая палітыка партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР у 1970-я гг. (на прыкладзе Віцебскай і Магілеўскай абласцей) / І. А. Пушкін // Веснік Магілеўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. Серыя А. Гуманітарныя навукі. – 2018. – № 2. – С. 25–30.
3. Пушкін, І.А. Кадравы патэнцыял прамысловасці БССР па матэрыялах рэгіянальных органаў КПБ / І.А. Пушкін // Кадравая і антыкарупцыйная палітыка як фактары развіцця грамадзянскай супольнасці: зборнік навуковых прац Міжнар. навук.-практ. канф., Магілеў, 24–25 мая 2018 года / Маг. дзярж. ун-т харч. ; уклад. : І. А. Пушкін, Ю. М. Бубнаў; рэдкал. : Ю. М. Бубнаў (адк. рэд.) [і інш.]. – Магілеў: МДУХ, 2018. – С. 65–73.
4. Пушкін, І.А. Пралікі ў кадравай палітыкі БССР у 1970-я гг. / І. А. Пушкін // Современная молодежь и общество: сб. науч. статей. Вып. 6 : Историческая память и преемственность. Диалог поколений. – Минск: РИВШ, 2018. – С. 29–33.
5. Справки о составе и сменяемости руководителей промышленных предприятий и объединений БССР за 1984–1987 гг. // НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 156. Спр. 982. Арк. 1–2 ; Спр. 406. Арк. 4–5.
6. Федоров, А.В. Кадровая политика СССР на завершающем этапе индустриальной модернизации (конец 1950–1980-е гг.): автореферат диссертации на соискание ученой степени к.ист.н.: специальность 07.00.02 / А.В. Федоров. – Москва, 2005. – С. 9–14.